**Білет 17**

**Практычнае заданне.**

**Станаўленне беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці. Удзел БССР у стварэнні СССР. Узбуйненне тэрыторыі БССР.**

**Выкарыстоўваючы прадстаўленыя матэрыялы, адкажыце на пытанні (выканайце заданні):**

1. Якімі былі прычыны стварэння Саюза Сацыялістычных Рэспублік (СССР)? Пацвердзіце адказ цытатамі з матэрыялаў.
2. Назавіце прынцыпы аб'яднання савецкіх рэспублік у СССР.
3. Якая была форма дзяржаўнага ладу ў СССР?
4. Складзіце храналагічную табліцу па тэме: «Тэрытарыяльныя змяненні ў БССР у 1921–1926 гадах». Якія гістарычныя падзеі паўплывалі на працэс фарміравання тэрыторыі рэспублікі ў гэты перыяд?

**I. Удзел БССР ва ўтварэнні Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік.** *(па матэрыялах вучэбнага дапаможніка «Гісторыя Беларусі. 1917 г. – пачатак XXI ст. 9 клас»).*

У працэсе пошуку і выпрацоўкі канкрэтных формаў аб'яднання савецкіх рэспублік у адну дзяржаву І. В. Сталін выступіў з ідэяй «аўтанамізацыі». Згодна з ёй усе савецкія рэспублікі павінны былі аб'явіць сябе састаўнымі часткамі Расійскай Савецкай Федэратыўнай Сацыялістычнай Рэспублікі (РСФСР) і ўвайсці ў яе склад на правах нацыянальна-культурнай аўтаноміі. У.І. Ленін прапанаваў іншую форму дзяржаўнага ладу - федэрацыю. Яна ўяўляла сабой саюз некалькіх дзяржаў, у якім яны падпарадкоўваюцца адзінаму цэнтру і пры гэтым захоўваюць самастойнасць у вырашэнні асобных пытанняў унутранай палітыкі.

Ідэя У.І.Леніна была падтрымана на IV Усебеларускім з'ездзе Саветаў у снежні 1922 г. у Мінску. Дэлегаты з'езда аднагалосна адобрылі ідэю стварэння Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік (СССР).

30 снежня 1922 г. дэлегацыі Расійскай Сацыялістычнай Федэратыўнай Савецкай Рэспублікі, Украінскай Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі, Беларускай Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі і Закаўказскай Сацыялістычнай Федэратыўнай Савецкай Рэспублікі (Арменія, Грузія, Азербайджан) на І Усесаюзным з'ездзе Саветаў у Маскве падпісалі Дэкларацыю і Дагавор аб утварэнні СССР.

Урад СССР выдаў дэкрэт аб перадачы Беларускай ССР паветаў Віцебскай, Гомельскай і Смаленскай губерняў, якія раней уваходзілі ў РСФСР, у якіх большасць насельніцтва складалі беларусы.

**II. З Дэкларацыі аб утварэнні Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік (30 снежня 1922 г.)**

…Раскіданыя палі, заводы, якія спыніліся, знясіленыя гаспадарчыя рэсурсы, пакінутыя ў спадчыну ад грамадзянскай вайны, робяць недастатковымі намаганні асобных рэспублік па гаспадарчым будаўніцтве. Аднаўленне народнай гаспадаркі аказалася немагчымым пры раздзельным існаванні рэспублік.

З іншага боку, няўстойлівасць міжнароднага становішча і небяспека новых нападаў робяць непазбежным стварэнне адзінага фронта савецкіх рэспублік перад абліччам капіталістычнага асяроддзя…

Усе гэтыя абставіны патрабуюць аб'яднання савецкіх рэспублік у адну саюзную дзяржаву, здольную забяспечыць і знешнюю бяспеку, і ўнутраны гаспадарчы поспех, і свабоду нацыянальнага развіцця народаў.
Воля народаў савецкіх рэспублік, якія сабраліся нядаўна на з'езды сваіх саветаў і аднадушна прынялі рашэнне аб утварэнні "Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік", служыць надзейнай парукай у тым, што Саюз гэты з'яўляецца добраахвотным аб'яднаннем раўнапраўных народаў, што за кожнай рэспублікай забяспечана права вольнага выхаду з Саюза, што новая саюзная дзяржава паслужыць вернай апорай супраць сусветнага капіталізму і новым крокам на шляху да аб'яднання працоўных усіх краін у Сусветную Сацыялістычную Савецкую Рэспубліку.

## III. Картасхема. Тэрыторыя БССР у 1921–1926 гг.

